Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта,
намеснік Міністра адукацыі

__________ Р.С. Сідарэнка

«11» студзеня 2017 года

ТРЭЦІ ЭТАП XXXIV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## 9 клас

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

### Варыянт I

**Заданне 1.** Вызначце, на які склад падае націск у формах назоўнага склону прыведзеных у табліцы слоў, калі яны ўжываюцца ў множным ліку і ў спалучэнні з лічэбнікамі *два (дзве)*, *тры*, *чатыры*. Парадкавы нумар націскнога склада ў словаформе і літару, што абазначае націскны гук, запішыце ў адпаведным слупку паводле ўзору, паказанага для слова *качарга*.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала – за кожны правільны адказ)

| Адзіночны лік | Множны лік | З лічэбнікамі *2*, *3*, *4* |
|---|---|---|
| **Узор:** ***качарга*** | **2, э** | **3, і** |
| *конь* | | |
| *год* | | |
| *галава* | | |
| *вясло* | | |

**Заданне 2.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай форме, складзіце пяць фразеалагізмаў з кампанентам ***язык*** (таксама ў патрэбнай граматычнай форме), запісаўшы іх у правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *адсохнуць, без, воля, даваць, за, злізаць, зуб, каб, карова, косць, трымаць, як*.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| | |
|---|---|
| ‘вокліч абурэння, асуджэння таго, хто сказаў што-небудзь непрымальнае’ | |
| ‘нічога не гаварыць лішняга, быць асцярожным у выказваннях; маўчаць, калі трэба’ | |
| ‘хто-небудзь бясследна знік, перастаў існаваць ці што-небудзь раптоўна знікла’ | |
| ‘дазваляць сабе гаварыць лішняе; лаяцца’ | |
| ‘хто-небудзь вельмі балбатлівы, гаворыць лішняе’ | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Поближе к зоопарку, в доме у детской площадки, обезьянки увидели в окошке старушку с зонтиком под мышкой. Старушка стирала в маленьком тазике свои наволочки и тоже справлялась сама. Совсем рядом с детской площадкой две толпы, школьников и дошкольников, о чём-то спорили, и обезьянки уже размечтались, что сейчас потребуется их помощь: мирить школьников с дошкольниками. Но те вдруг перестали спорить, начали все вместе поливать какое-то растение, торчащее возле качелей *(По Г. Б. Остеру)*.

**Заданне 4.** *«Ах, Лявоніха, Лявоніха мая!»* – успамінае добрым словам жонку Лявона – весялуху і працаўніцу – М. Багдановіч. А як называюць жонку *салдата, барона, дзядзькі, брата, грабара*? Запоўніце табліцу па ўзоры.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала за кожнае правільна падабранае, 0,5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову і кожны правільна вызначаны сродак словаўтварэння).*

| Значэнне слова | Слова | Утваральная аснова і сродак словаўтварэння |
|---|---|---|
| **Узор: *'жонка Лявона'*** | *Лявоніха* | Лявон (□)+ іх(а) |
| 'жонка салдата' | | |
| 'жонка барона' | | |
| 'жонка дзядзькі' | | |
| 'жонка брата' | | |
| 'жонка грабара' | | |

**Заданне 5.** Дапішыце ў табліцу, дзе трэба, назоўнікі ў форме адзіночнага ці множнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал за кожнае правільна запісанае слова).*

| Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|
| | поцемкі |
| кляймо | |
| | двайняты |
| бутля | |
| | дзяўчаты |

**Заданне 6.** Падбярыце беларускія адпаведнікі да прапанаваных словазлучэнняў.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| |
|---|
| 1. ожидаемый результат – |
| 2. обслуживающий персонал – |
| 3. определяющая роль – |
| 4. разлезшиеся ботинки – |
| 5. странствующий театр – |

**Заданне 7.** Як кажуць, розум не купіш – у галаву не ўлieш. Але ў кожнага свая галава на плячах, як *у рыбы – рыбіна, у рысі – рысіная*. **А чыя галава ў *сарокі, тхара, авечкі, вярблюда, аленя*?** Вызначце і запішыце, выкарыстоўваючы адпаведныя прыметнікі.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

у сарокі – __________________
у тхара – __________________
у авечкі – __________________
у вярблюда – __________________
у аленя – __________________

**Заданне 8.** Прачытайце ўрыўкі з вядомых прадмоў. Вызначце, хто іх аўтар і да якога тэксту (кнігі) яны напісаны.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1. Але даў бы тое Госпад, каб вы, кожны сам па сабе, о шляхетныя панове, якія засталіся нібы бацькамі гэтай мовы пасля гэткіх слаўных продкаў сваіх і месцы іхнія занялі, паколькі ў гэтай (справе) ніякае дапамогі ад людзей з-за граху няма, то толькі вы самі гэтаму з любові да Айчыны маглі б дапамагчы… У гэтай патрэбе Айчыны вашай, у звычайным клопаце аб недастатковасці навукі братам вашым (будзьце) прыкладам міласэрным… – каб гэтаму вашаму народу, невуцтвам сапсаванаму і засмучанаму, дапамагчы... Вось бы для навукі, але не такой, як цяпер на адвечны свой сорам толькі ледзь-ледзь прачытаць на сваёй мове збольшага вучацца, – каб заснаваць школы і навуку Божага слова, на працягу гэтулькіх год занядбалую, узняць захацелі браціі вашай (дапамагчы) і змаглі. (________________________________________)

2. ДА НАЙЯСНЕЙШАЙ УЛАДАРКІ І ПАНІ БОНЫ З ЛАСКІ БОЖАЙ КАРАЛЕВЫ ПОЛЬШЧЫ, ВЯЛІКАЙ КНЯГІНІ ЛІТВЫ, РУСІ, ПРУСІІ І ІНШ. ПАНІ. Калі ж ты праявіш сябе добразычлівай, схільнай да апякунства навукі і мастацтва, тады ад іх будзе і дзяржаве вялікая карысць, а высокая слава імя твайго распаўсюдзіцца такім чынам яшчэ вышэй з ухвалай тваіх (выхаванцаў). Бо што можа быць больш цудоўным і вартым тваіх продкаў і тваёй найслаўуцейшай з арагонскага дома сям'і, больш дасканалым з усіх форм дабрачыннасці, калі на іх грунтоўна глядзець і ў мірны час, і ў вайну, і ў справе рэлігіі? (________________________________)

3. Божа ж мой, Божа! Што ж мы за такія бяздольныя? Якаясь маленькая Булгарыя – са жменя таго народу, – якіясьці Харваты, Чэхі, Маларосы і другія пабратымцы нашыя … маюць па-свайму пісаныя і друкаваныя ксёнжачкі і газэты, і набожныя, і смешныя, і слёзныя, і гісторыйкі, і баячкі; і дзеткі іх чытаюць так, як і гавораць, а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык, можа б, і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што “піша па-мужыцку”, і як дурня абсмяялі б! А можа, і спраўды наша мова такая, што ёю нічога добрага ні сказаць, ні напісаць не можна? Ой, не! Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людцам… (________________________________________)

4. Доўга я гадаў і думаў, як сябе зваць, ці то палякам, ці то літоўцам, бо слова "тутэйшы" мне нексць не смакавала. І так колькі гадоў я хістаўся то на ту, то на другую сторану, аж покі не папала ў мае рукі «Дудка» Мацея Бурачка: яна-то мне сказала, што хто гаворыць па-тутэйшаму, па-мужыцку, значыцца, ён гаворыць па-беларуску, а хто гаворыць па-беларуску, той беларус. Прачытаўшы тую "Дудку", я сказаў: "Дзякуй табе, Мацей Бурачок! Чэсць і слава тваему слову! А ты, "Дудка", грай і мне голас дай". З таго дня пачаў і я майстраваць інструмант. Выйшла з-пад рук "Скрыпка". (________________________________________)

5. Потым яшчэ цяжэйшыя выпрабаванні для тых, хто ахрысціцца хацеў, прыйшлі. Знаходзім бо ў пасланнях настаўнікаў і ў некаторых правілах: тыя, што хрысціцца хацелі, перш немалы час павінны былі асобна ад іншых у царкве стаяць; на калені прыпадаць, чытанне Евангелля пачуўшы; а больш таго, калі пачыналася вячэра Госпадава, вон з царквы выходзілі; таксама вызначаны час пасцілі і кожны тыдзень у чацвер "Веру..." перад епіскапам ці прасвітарам вызнавалі. А пакуль гэта ўсё хто не выканае, ахрышчаным быць не мог, але звалі яго "абвешчаным", а па-грэцку – "катэкуменос". Навуку ж іхнюю такую называлі Абвяшчэннем, па-грэцку – Катэхізіс. (________________________________________)

**Заданне 9.** Прачытайце цытаты. Адкажыце на пытанні, размешчаныя ў першай калонцы табліцы. Адказы запішыце ў трэцяй калонцы насупраць адпаведных цытат. Унізе, у апошнім радку табліцы, прывядзіце аўтарскае (альбо ўласнага сачынення) чатырохрадкоўе з парнай рыфмай, напісанае чатырохстопным ямбам.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Як бы вы вызначылі вершаваны памер наступных радкоў? | Заспявай жа ты песню такую,<br>Каб маланкай жахала яна<br>І паліла нядолю людскую,<br>Каб грымела, як гнеў перуна.<br>(Якуб Колас. «Песняру») | |
| **2.** | Якія тропы выдзелены курсівам? | ...Што меж майму цярпенню не знайсці,<br>Што так вяліка мне яно ў жыцці,<br>*Як міліёнаў разам усіх цярпенне.*<br>(Янка Купала. «Маё цярпенне») | |
| **3.** | Які сродак сінтаксічнай выразнасці ўжыты ў выдзеленых фрагментах тэксту? | Усё праходзіць, быццам дождж няроўны, –<br>*І* боль, і злосць, *і* дробная брыда,<br>А застаецца важны і галоўны<br>*І* самы светлы талент – дабрата.<br>(Сяргей Грахоўскі. «Дабрата») | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **4.** | Як называюцца выдзеленыя словы, ужытыя ў мастацкім тэксце? | – Ну, куды? – Яўхім павёў плячамі. – Ну, пайду, пашукаю весялейшай *кумпаніі*!..<br>– Глядзі, *недалёко*. *Штоб* на бандзітаў не нарвацца! Чуў я, у Мокуці ўчора *булі*...<br>(Іван Мележ. «Людзі на балоце») | |
| **5.** | | | |

**Заданне 10.** Вызначце аўтараў паводле назваў іх твораў: 1) Прадмова да кніг «Юдзіф», «Псалтыр», 2) «Чортаў скарб», «Балада пра Вячку, князя людзей простых», 3) «Магіла льва», «Мая малітва», 4) «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам... », «Дзіўны лапаць, або Не ўсё тое порах, што ў пораху ляжыць», 5) «Гражына», «Пан Тадэвуш».

Запішыце іх імёны і прозвішчы на сучасную карту Беларусі ў адпаведнасці з месцам нараджэння.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*



ЗАЦВЯРДЖАЮ

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі
________________ Р.С. Сідарэнка
«17» студзеня 2017 г.

ТРЭЦІ ЭТАП XXXIV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР

**9 клас**

(Варыянт І)

## МОВА

Бывае,
спатрэбіцца ўзімку
Промень, не злоўлены летам,
Бывае,
што мала пахаў
У моры травінак і красак,
Бывае,
не хопіць колераў
У вясновым квяцістым разліве,
Бывае,
так мала гукаў
Чуецца ў моры лесу,
Бывае, не радуюць песні
Мора крылатага птушак –
Тады я іду да цябе,
Мой акіян вялікі,
У які ўсе моры ўпадаюць, –
Мая
адзіная
мова!

*Янка Сіпакоў (1980-я)*

Даведка

ВОДГУК НА МАСТАЦКІ ТВОР

9 клас

(Варыянт 1)

МОВА

| Этапы аналізу | Сродкі |
|---|---|
| **1. Фонавыя веды** аўтар, гістарычныя ўмовы, перадумовы напісання твора, этап развіцця літаратуры і творчасці пісьменніка, літаратурны кантэкст | Іван Данілавіч Сіпакоў (1936–2011). Першы верш у аршанскай раённай газеце «Ленінскі прызыў» (1953), а ў 1960 – першы паэтычны зборнік «Сонечны дождж», да 1980-х адносіцца зб. «Усміхніся мне» (1984), апошні зб. – «Ахвярны двор» (1991). Сталы этап творчасці. Кантэкст – Танк (З легендаў), Разанаў (…аднойчы мова прарасла), Зарыцкі (Мова, пявучая родная мова), Пысін (Дала мне маці гэту мову), Зуёнак (Я хачу, каб народ мой мяне пачуў), Бураўкін (Я ведаю, нядобрых моў няма), Бічэль (Пад казачным дубам), Гілевіч (Адкажы), Грахоўскі (Каля вогнішча), Барадулін (Жаданне) і інш. Этап развіцця літаратуры – сучасны. |
| **2. Літаратуразнаўчы аналіз** род і жанр, тэма, ідэя і праблематыка, пафас, змест, сюжэт, кампазіцыя | Грамадзянская лірыка, верш. Тэма роднай мовы. Ідэя – далучэнне чытача да скарбаў роднага слова. Тэкст структураваны паводле каляндарнага цыклу – пораў года (ўзімку, летам, вясновым…). Топас – лесу, лугу, акіяна. Тэхнічна кампазіцыя выканана найперш пры дапамозе сінтаксічных сродкаў. |
| сістэма вобразаў, від, характарыстыка | Мова – акіян (асацыяцыі з сэнсамі бязмежнасць, глыбіня, таямнічасць, невычэрпнасць, аднаўленне, узбагачэнне (моры ўпадаюць)). Алегарычнасць. |
| мастацкія сродкі: тропы , сродкі сінтаксічнай, гукавой выразнасці, метрыка | Эпітэты (не злоўлены промень, вясновым квяцістым разліве, акіян вялікі (полісем. – вялікі паводле памеру вялікі паводле значнасці), мора крылатага), гіпербала (мова – цэлы акіян, у які ўсе моры ўпадаюць), супрацьпастаўленне (мора птушак, мора красак, травінак, мора лесу – мала гукаў, мала пахаў, не хопіць колераў), сінтаксічны паралелізм членаў перыяду (павышэнне), паўтор (5-разовы, бывае), танічнае вершаскладанне (тры націскныя склады ў радку). |
| **3. Лінгвістычны аналіз** лексічныя сродкі паводле актыўнасці, сферы ўжывання, паводле паходжання , эмацыянальнай афарбоўкі, семантыкі; фразеалогія | Памяншальна-ласк. суфікс (травінак). Сінанімія (не хопіць – мала). |
| граматычныя сродкі: марфалагічныя, | Асабовы і прыналежныя займеннікі ў частцы паніжэння перыяду (я, мой, мая) як супрацьпастаўленне |

| | |
|---|---|
| сінтаксічныя | безасабовым канструкцыям (мала пахаў, не хопіць колераў) у павышэнні. Множны лік назоўнікаў (пахаў, класак, колераў) як супрацьпастаўленне адзіночнаму (адзіная мова). Адмоўныя часіцы пры ддзеясловах і дзясл. формах (не хопіць, не злоўлены, не радуюць) у першай частцы і сцвярджэнне (іду, упадаюць) у другой. Пабочныя словы арганізуюць часткі перыяду. |
| уздзеянне на адчуванні | На слых (гукаў, песні), пах (пахаў), дотык (промень), зрок (колераў). |
| **4. Стылістычны аналіз** | – |
| **5. Тэксталагічны аналіз** | Сіпакоў, Я. Выбраныя творы. Мінск, 1995. |

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі

________________ Р.С. Сідарэнка

«_11_» ______ 2017 г.

Заключны этап XXXIV Рэспубліканскай алімпіяды
па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і
«Беларуская літаратура»

## Крытэрыі ацэнкі конкурсу «Водгук на мастацкі твор»

*Максімальная колькасць балаў – 30*

| | |
|---|---|
| **I. УМЕННЕ ВЫЯЎЛЯЦЬ АСНОЎНУЮ ТЭМАТЫКУ І ПРАБЛЕМАТЫКУ ТВОРА, АЎТАРСКУЮ ПАЗІЦЫЮ (2 БАЛЫ)** | |
| **2 б.** | *правільнае разуменне тэмы і праблемы твора, дакладнае вызначэнне і абгрунтаванне аўтарскай пазіцыі* |
| **1 б.** | *няпоўнае разуменне тэмы і праблемы твора, недастаткова поўнае асвятленне аўтарскай пазіцыі* |
| **0,5 б.** | *прыблізнае разуменне тэмы і праблемы твора, выяўленне асобных спосабаў раскрыцця аўтарскай пазіцыі* |
| **II. УМЕННЕ АБГРУНТОЎВАЦЬ ПРАЧЫТАНАЕ (6 БАЛАЎ)** | |
| **6 б.** | *дакладнае і вычарпальнае абгрунтаванне ўласнага прачытання твора; наяўнасць чытацкага вопыту (звесткі пра аўтара, паралелі з іншымі творамі, спасылкі на іншых аўтараў, цытаты, уласныя паэтычныя радкі і інш.); дарэчнасць ілюстрацыйнага матэрыялу, яго дакладнасць, доказнасць, мэтазгоднасць, эфектыўнасць* |
| **4–5 б.** | *наяўнасць цікавых назіранняў над творам, пэўнага чытацкага вопыту, эпізадычнае абгрунтаванне ўласных высноў са спасылкай на тэкст і творы іншых аўтараў* |
| **3 б.** | *ацэнка асобных (2–3) аўтарскіх перакананняў, думак, разважанняў; частковае абгрунтаванне ўласнага прачытання твора* |
| **2 б.** | *наяўнасць асобных цікавых назіранняў над творам без прывядзення неабходнай аргументацыі да іх* |
| **1 б.** | *канстатацыя арыгінальнасці прачытанага, але адсутнасць доказаў, наяўнасць фактычных, лагічных памылак у аргументацыйнай частцы, абмежаваны чытацкі вопыт, недакладнасць, спрошчанасць асабістай ацэнкі, пераказ зместу твора, недарэчнае цытаванне твораў вядомых аўтараў* |
| **III. УМЕННЕ ВЫЗНАЧАЦЬ РОЛЮ СЮЖЭТА, КАМПАЗІЦЫІ, ВЫЯЎЛЕНЧЫХ СРОДКАЎ ВЫРАЗНАСЦІ (7 БАЛАЎ)** | |
| **7 б.** | *дакладнае вызначэнне кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, вобразаў, мастацкіх сродкаў выразнасці і іх цікавая, арыгінальная інтэрпрэтацыя* |

| | |
|---|---|
| **5–6 б.** | *нязначныя недахопы ў інтэрпрэтацыі вобразных сродкаў і структуры тэксту* |
| **4 б.** | *наяўнасць нешматлікіх (1–2) памылак у вызначэнні і інтэрпрэтацыі кампазіцыі твора, сюжэтных ліній, вобразаў, выяўленчых сродкаў* |
| **3 б.** | *інтэрпрэтацыя асобных элементаў тэксту* |
| **2 б.** | *павярхоўнае бачанне ролі сюжэта, кампазіцыі, вобразаў, мастацкіх сродкаў выразнасці ў раскрыцці тэмы і ідэі твора; недакладнасці ў вызначэннях* |
| **1 б.** | *пералічэнне выяўленчых сродкаў без абгрунтавання іх ролі ў мастацкім творы* |
| | **IV. МОЎНАЕ І КАМПАЗІЦЫЙНАЕ АФАРМЛЕННЕ ВОДГУКУ (3 БАЛЫ)** |
| **3 б.** | *прадуманасць кампазіцыі (адпаведнасць кампазіцыі водгуку асаблівасцям тыпу і жанру маўлення), багацце, разнастайнасць моўных сродкаў, дакладнасць словаўжывання* |
| **2 б.** | *нязначныя парушэнні кампазіцыйных частак, асобныя недахопы моўнага выражэння* |
| **1 б.** | *парушэнне жанравай цэласнасці водгуку, яго структурных (адсутнасць уступу або заключэння) і стылістычных патрабаванняў; парушэнне лагічнай сувязі кампазіцыйных частак, іх несуразмернасць; недахопы моўнага выражэння (беднасць слоўнікавага запасу, русізмы, калькі, моўныя штампы)* |
| | **V. ПІСЬМЕННАСЦЬ (10 БАЛАЎ) – ПА КРЫТЭРЫЯХ АЦЭНКІ ТВОРЧЫХ РАБОТ ВУЧНЯЎ** |
| 1 | Больш як на 2 балы |
| 2 | ад 7/2 да 10/1 і 10 граматычных памылак |
| 3 | 0/8, 1/7, 2/6, 3/5, 4/4, 5/3, 6/2, 7/1 і 7 граматычных памылак |
| 4 | 0/7, 1/6, 2/5, 3/4, 4/3, 5/2, 6/0, 6/1 і 6 граматычных памылак |
| 5 | 0/6, 1/5, 3/3, 4/2, 5/0, 5/1 і 5 граматычных памылак |
| 6 | 0/5, 1/4, 2/3, 3/2, 4/0, 4/1 і 4 граматычныя памылкі |
| 7 | 0/4, 1/3, 2/1, 2/2, 3/0, 3/1 і 3 граматычныя памылкі |
| 8 | 2/0, 1/1, 1/2, 0/2, 0/3 і 2 граматычныя памылкі або 3 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| 9 | 1/0, 0/1 і 1 граматычная памылка, або 1–2 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| 10 | 0/0, 1/0 (нягрубая), 0/1 (нягрубая), 1–2 выпраўленні не на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| | **VI. ТВОРЧЫ ХАРАКТАР РАБОТЫ (2 БАЛЫ)** |
| **2 б.** | *арыгінальнасць трактоўкі, якая не пярэчыць сутнасным характарыстыкам мастацкага твора; дакладнасць, навуковы кругагляд, наяўнасць нестандартнай формы, яе мэтазгоднасць, эфектыўнасць пры дасягненні пастаўленых камунікатыўных задач* |
| **1 б.** | *наяўнасць асобнага(ых) цікавага(ых) назірання(яў), гісторыка-культурных параўнанняў, паралеляў з іншымі творамі; спрошчанасць, традыцыйнасць высноў; немэтазгоднасць абраных сродкаў і формы для вырашэння пастаўленых камунікатыўных задач* |